*Стракаты свет*

## ІМЯ ПЕРШАГА НАСТАЎНІКА — НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

**Пераважная большасць дарослых расіян (97 працэнтаў) памятае імя свайго першага настаўніка, паказала апытанне SuperJob. Толькі тры працэнты апытаных забыліся, як звалі іх педагога ў першым класе.**

Жанчыны памятаюць імя першага настаўніка часцей за мужчын (98 працэнтаў супраць 96 працэнтаў), а рэспандэнты з больш высокім даходам — часцей за тых, хто атрымлівае менш.

Цікава, што на вынікі даследавання практычна не ўплывае ўзрост апытаных: сярод рэспандэнтаў ва ўзросце да 34 гадоў імя першага настаўніка забыўся адзін працэнт, у групе ад 35 да 44 гадоў — тры працэнты, у групе старэйшых за 45 гадоў — два працэнты.

## СТЫПЕНДЫЯ ЗА ВЕДАННЕ ЗАМЕЖНАЙ МОВЫ




**Ва Узбекістане з'явілася дадатковая стыпендыя для студэнтаў, якія валодаюць замежнай мовай на высокім узроўні, паведамляе прэс-служба міністэрства аховы здароўя рэспублікі.**

Выплата пачала дзейнічаць ужо з 2023/2024 навучальнага года. Заахвочваюць ёю студэнтаў медыцынскіх ВНУ і тэхнікумаў, якія маюць міжнародна прызнаны сертыфікат па англійскай, нямецкай або французскай мове з вынікам, не ніжэйшым за ўзровень С1. Выплачваюць стыпендыю ў памеры трох базавых разліковых велічынь штомесяц у дадатак да звычайных выплат на працягу ўсяго тэрміну дзеяння сертыфіката.

Для назначэння стыпендыі рэктары ВНУ і тэхнікумаў павінны штоквартальна падаваць спісы ў Дэпартамент навукі і адукацыі міністэрства. Як удакладнілі ў яго прэс-службе, цяпер у дзевяці медыцынскіх ВНУ краіны навучаецца 56 студэнтаў з высокім веданнем замежных моў.

## МЁД У ШКОЛЬНЫМ МЕНЮ ДЛЯ ІМУНІТЭТУ



**Лідар партыі «Новыя людзі» Аляксей Нячаеў звярнуўся да кіраўніка Расспажыўнагляду Ганны Паповай з прапановай уключыць мёд у меню школьных сталовых. На думку аўтара ініцыятывы, гэта «павысіць імунітэт школьнікаў і знізіць агульную стамляльнасць», паведамляе ТАСС.**

Дэпутат нагадаў, што ў некаторых расійскіх рэгіёнах мёд ужо ўключаны ў рацыён школьнікаў. У той жа час у метадычных рэкамендацыях Расспажыўнагляду мёд паказаны толькі як харчовы прадукт, які можа быць выкарыстаны для фарміравання конкурснай дакументацыі для арганізацыі харчавання навучэнцаў.

«Адсутнасць мёду ў рэкамендаваным прыкладным меню, а таксама ў неабходных сярэднясутачных наборах харчовых прадуктаў для навучэнцаў цягне да сітуацыі, калі большасць школ у Расіі не ўключаюць яго ў рацыён харчавання школьнікаў. Уключэнне мёду ў іх харчаванне здольнае прыкметна ўмацаваць здароўе. Замест цукру дастаткова дзесяці яго грамаў у дзень».

Да таго ж, на думку дэпутата, рэалізацыя гэтай ініцыятывы падтрымае малы і сярэдні бізнес, які займаецца вытворчасцю мёду, а прыярытэтнымі яго пастаўшчыкамі ў школы краіны могуць стаць лакальныя малыя гаспадаркі і фермеры.

## НА ВУЧОБУ ПАСТУПІЛІ ТРЫ ПАКАЛЕННІ СЯМ'І

**У Карфагенскі каледж, размешчаны ў Кеношы, амерыканскі штат Вісконсін, сёлета паступілі прадстаўніцы трох пакаленняў адной сям'і. У навучальнай установе ўпершыню ў гісторыі ВНУ будуць адначасова атрымліваць адукацыю бабуля, маці і дзве дачкі. Пра гэта паведамляе CNN.**

Сёстры Саманта Мальчэўскі і Мія Картэр нават будуць жыць у адным пакоі ў інтэрнаце. Першая атрымлівае спецыяльнасць медсястры, а другая будзе вывучаць бухгалтарскі ўлік. Іх маці, Эмі Мальчэўскі, больш за 20 гадоў працуе на кампусе Карфагенскага каледжа, яна выкладае графічны дызайн і займаецца кар'ерным кансультаваннем студэнтаў, а дочкі бывалі ў яе на працы з самага дзяцінства. У гэтым годзе Эмі вырашыла працягнуць сваю адукацыю і паступіла ў магістратуру каледжа. Калі Эмі прыняла гэтае рашэнне, яна прапанавала пайсці павучыцца і сваёй маме і бабулі дзяўчынак, Крысці Шван. Тая, нядоўга думаючы, пагадзілася. Бабуля Саманты і Міі выбрала кірунак «Бізнес-дызайн і інавацыі».

Па словах віцэ-прэзідэнта прыёмнай камісіі каледжа Эшлі Хэнсан, ёй сустракаліся сем'і, у якіх усе дзеці вучыліся ў іх. Таксама даволі часта ў Карфаген ідуць вучыцца дзеці і ўнукі выпускнікоў. Сёлета сярод тых, хто паступіў, іх каля 70 чалавек. Аднак каб бабуля, маці і ўнучкі-дачкі вучыліся адначасова... «Я, спадзяюся, паступленне Крысці Шван паслужыць прыкладам для многіх і доказам таго, што вучыцца можна на працягу ўсяго жыцця. Я, можа, сама пайду абараняць доктарскую, калі мне будзе 80 гадоў», — сказала віцэ-прэзідэнт прыёмнай камісіі.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

# «Пры ўсёй магіі тэлебачання важна заставацца сабой»



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Шоу «Фактар.by» ўжо трэці сезон у эфіры. Па вашых назіраннях і вопыце ўдзелу ў падобных праектах што важней: прайсці адбор на этапе кастынгаў ці затрымацца там?***

— Тут галоўнае адразу разумець свае моцныя і слабыя бакі. Сама, напрыклад, раней нават не разумела, за што мяне адабралі, хоць, зразумела, спяваць я ўмею. І сёння на такім праекце я паводзіла б сябе зусім па-іншаму. Ладзіла б шоу, дзялілася б сваімі гісторыямі. Таму на месцы ўдзельнікаў проста б расслабілася і атрымлівала задавальненне, ішла за тымі, хто накіроўвае: адміністратары, рэдактары, бо яны ведаюць, як зрабіць добра, і ніколі не будуць выстаўляць вас у непрывабным святле. І варта з самага пачатку падумаць, як я сябе паводжу на праекце. Так, тут працуе магія тэлебачання з яе здольнасцю прымнажаць і ўпрыгожваць, але важна заставацца сабой. З уласнага вопыту скажу, што наша шоу адрозніваецца ад падобных у іншых краінах. Узяць тыя ж умовы пражывання для канкурсантаў. Напрыклад, нельга, не закрыўшы базавыя патрэбы людзей, гаварыць пра нешта больш узвышанае. А я за мяжой сутыкалася менавіта з тым, як на людзях умеюць эканоміць. Ва ўсім важны баланс.

***— На ваш погляд, чым у наш час вымяраецца папулярнасць?***

— Глядзіце, мільёны ведаюць спявачку Вольгу Бузаву. Яна чалавек, які робіць на сцэне, у кадры неверагодныя рэчы. І яна зрабіла ў шоу-бізнесе сама сябе. Нават свае сацыяльныя сеткі Вольга вядзе самастойна. Таму, калі мы гаворым пра папулярнасць, то важна не толькі колькасць падпісчыкаў, напрыклад, а найперш тое, наколькі цікавы чалавек, на якога людзі падпісаны. Ці не забывае артыст, блогер пра якасць кантэнту, якім дзеліцца. Ці дазваляе зробленае імі дапамагаць іншым. Толькі глыбіня асобы, яе шчырая творчасць знаходзяць у аўдыторыі водгук і выклікаюць інтарэс.

Мне, напрыклад, хочацца не пазнавальнасці, а быць зразумелай і пачутай. А для гэтага ў нашай сферы трэба шмат працаваць, хоць часам усё вырашае выпадак. Цяпер усё няпроста, бо кожны творчы, публічны чалавек знаходзіцца пад пільнымі позіркамі аўдыторыі. Можна мець шмат магчымасцяў, ведаў, а пасля адзін неасцярожны крок, выказванне ў імгненне перакрэсляць тваю рэпутацыю.

***— «ПІН_КОД» — гэта праца ў прамым эфіры. Ці было хваляванне перад камерай?***

— На праекце я ўжо працую з 17 верасня 2020 года. Тады вырашыла сумясціць першы курс універсітэта з выхадам на работу. Хоць вопыт вядзення прамых эфіраў мела зусім сціплы. Думала, можа, гэта мне дапаможа, але памылялася. На тых жа конкурсах, напрыклад, працаваць значна прасцей, бо ёсць аўдыторыя і суявдучы. Таму і на праекце мне пашчасціла, што ў першы эфір я выйшла са сваёй калегай Кацярынай Дадзеркінай. У ёй адчувала сваю апору. А праз нейкі час, «набіўшы руку» і натрэніраваўшыся, стала працаваць сама. У гэтай прафесіі галоўнае — праяўляць цікавасць і засвойваць інфармацыю. І часам ты павінен быць у цэнтры ўвагі, калі хочаш быць найлепшым.

***— Чаму паставілі на паўзу сваю артыстычную дзейнасць?***

— Пасля ўсіх творчых праектаў, у якіх я ўдзельнічала, такі крок быў непазбежны. Мне важна было зразумець, як усё працуе ў гэтай сферы знутры. І для таго трэба было на ўсё зірнуць пад іншым ракурсам. Першапачаткова я думала, што буду займацца музыкай доўга і актыўна, паступлю на акцёрскае і застануся жыць у Маскве. А з часам прыняла рашэнне застацца дома, паступаць у БДУ і асвойваць прафесію піяршчыка. Паступіла і пайшла працаваць на тэлебачанне журналістам. Цяпер у мяне ні сну, ні адпачынку, а толькі праца. Імкнуся адшукаць баланс ва ўсім. І адчуваю, як мне не хапае музыкі. Часам нават засынаеш і прачынаешся з думкамі пра сцэну. Можа, таму што працую на музычных праектах. Магчыма, паўза якраз і патрэбна была для таго, каб зразумець, ці хачу я па-сапраўднаму ісці далей у адзеным напрамку.

***— Чаго вы ніколі не станеце рабіць за кампанію?***

— Я ніколі не буду рабіць таго, чаго не хачу. Выключэнне — хіба што адпачынак, на які мяне рэдка хто можа выцягнуць. А вось за кампанію неяк дзейнічаць ці мяняць свае погляды на нешта — гэта не пра мяне. Прычым усе ж разумеюць, напрыклад, што чым больш бацькі абмяжоўваюць дзяцей, тым больш тым хочацца зрабіць наадварот. Таму тут вельмі важна, каб была свабода ў дзяцінстве і давер у сям'і. Цяпер вакол нас ва ўсім пануе хаос. І таму трэба ўмець фільтраваць усё, што адбываецца, разумеючы, што ёсць кампаніі, у якія лепш не трапляць, месцы і людзі, якіх лепей абыходзіць.

***— У жыцці і ў працы што на вас больш уздзейнічае — крытыка ці пахвала?***

— Бывае крытыка, якая матывуе, а часам, калі хваляць, то гэта цябе крыху расслабляе. У маёй прафесіі ўвогуле нічога не вырашае меркаванне іншых людзей. Гэта толькі падказкі адносна таго, у якім напрамку рухацца. І калі вам удаецца правільна зладзіць пасыл, то можна і клад адшукаць. Толькі не трэба ўсё ўспрымаць літаральна. Часам штосьці кажуць, каб наўмысна абясцэніць вас і зробленае вамі, таму што бачаць побач канкурэнта. У маёй прафесіі ўсяго можна дасягнуць толькі працай і з падтрымкай людзей, якія ў цябе вераць.

***— Ці часта вы адчуваеце любоў, захапленне і да каго?***

— Я толькі нядаўна заўважыла, што мне важна дарыць пачуццё любові, шчыра казаць людзям пра свае пачуцці. Хочацца быць побач з любімымі. Бо адносіны з іншымі кожнага з нас напаўняюць, а пасля мы можам аддаваць сваю энергію далей. І апошнім часам я па-іншаму стала глядзець на рэчы, калі яны выклікаюць захапленне. Нядаўна, напрыклад, вярнулася ў трэнажорную залу. І гляджу на тых ж трэнажоры і думаю: як класна нехта іх распрацаваў, што чалавек паэтапна можна ісці да жаданага выніку. Таму я заўсёды ў захапленні ад тых, хто нешта стварае, дзейнічае, бачыць ва ўсім сэнс, стварае ўмовы, каб палегчыць іншым жыццё альбо дапамагчы дайсці да ўласнай мэты. Важна цаніць дробязі.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва гераіні.**
**Цалкам матэрыял чытайце на zviazda.by.**

ЧЫРВОНКА. ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №38200000007667 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 10.346.
Нумар падпісаны ў 19.30 22.11.2023 г.